3. *Дружчыц В.* Войты і іх улада ў беларускіх гаспадарскіх местах з майдэборскім правам // Запіскі Аддзелу Гуманітарных Навук. 1928. Кн. 3, т. 2. С. 241–298.
4. *Зорин Н. И.* Минувшее и настоящее г. Полоцка: к торжеству перенесения мощей пр. Евфросинии из Киева в Полоцк : крат. ист. очерк. Полоцк : Тип. Х. В. Клячко, 1910.
5. Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі : зб. навук. арт. Гродна : ГрДУ, 2009.
6. Полацак: падарожжа ў прасторы і часе : зб. арт. Мінск : Архэ-Пачатак, 2011.

# РОЛЯ ЖАНЧЫН У ЗАХАВАННІ КАТАЛІЦКАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

**М. М. Кароль**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*paparatm@gmail.com;*
*навук. кір. – М. П. Касцюк, д-р гіст. навук, праф.*

У артыкуле аналізуецца роля жанчын у падтрыманні і захаванні рэлігійнай ідэнтычнасці ў беларускіх губернях у другой палове XIX – пачатку XX ст. У дадзены перыяд расійскія ўлады праводзілі мерапрыемствы па пераводзе часткі насельніцтва з каталіцызму ў праваслаўе. Нярэдка гэта выклікала супраціўленне з боку тых, на каго была накіравана падобная дзейнасць. Аўтар паказвае, што жанчыны адыгравалі важную ролю ў захаванні каталіцкай рэлігійнасці – яны маглі самастойна адстойваць уласную рэлігійную ідэнтычнасць, а таксама ўплываць на мужчын у сваім атачэнні, перш за ўсё, мужоў і сыноў.

***Ключавыя словы***: рэлігійныя канверсіі; праваслаўе; каталіцызм; празелітызм; канфесійная ідэнтычнасць; жаночая гісторыя.

Праблема захавання канфесійнай ідэнтычнасці сфарміравалася ў беларускіх губернях у другой палове XIX ст. пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг., калі расійскія ўлады звярнулі пільную ўвагу на канфесійнае пытанне і сталі праводзіць мерапрыемствы па пашырэнні ўплыву праваслаўя на беларускіх землях. Гэта выявілася як у садзейнічанні вонкава добраахвотнаму пераходу часткі каталіцкага насельніцтва ў праваслаўе, так і прымушэнні былых уніятаў (фактычных католікаў) да выканання праваслаўных абрадаў. У такіх абставінах людзі, якія лічылі сябе католікамі, вымушаны былі захоўваць сваю канфесійную ідэнтычнасць насуперак дзяржаўным захадам.

Пры вывучэнні праблемы супраціўлення пераводам у праваслаўе асноўная ўвага звярталася на дзеянні мужчын, якія ўспрымаліся як асноўныя і адзіныя сацыяльныя актары. Але ў сучасных даследаваннях усё большы акцэнт робіцца на ўдзеле жанчын у фарміраванні розных сацыяльных, этнічных і культурных перакананняў.

Ужо ў XIX ст. разумелі, што жанчыны адыграюць важную ролю ў выхаванні і тым самым трансляцыі культурных каштоўнасцей. У гэтым рэчышчы расійскія ўлады асабліва непакоілася з-за магчымага ўплыву жанчын-каталічак на праваслаўнае атачэнне. У «Віленскім весніку» у 1865 г. літоўскі мітрапаліт Іосіф Сямашка прапаноўваў не дазваляць жаніцьбу святароў з дзяўчынамі няправаслаўнага веравызнання. Гэта прапанова была выклікана тым, што такія жонкі не маглі даць неабходнага першапачатковага праваслаўнага выхавання сваім дзецям [1, с. 27]. Расійскія ўлады, перш за ўсё, бачылі пагрозу ў тым, што праваслаўныя, асабліва чыноўнікі і афіцэры, якія бралі шлюб з жанчынамі-каталічкамі, маглі пад іх уплывам пачаць наведваць касцёл.

У 1864 г. маёр віцебскага батальёна ўнутранай варты падаваў рапарт, у якім выказваў занепакоенасць, што афіцэры батальёна, жанатыя на каталічках, падвяргаюцца іх уплыву, а іх дзеці робяцца «ні рускімі, ні палякамі». Такія дзеці не наведваюць праваслаўнай царквы, не ўмеюць хрысціцца на праваслаўны манер. З гэтага паведамлення вынікае, што афіцыйныя асобы ўсведамлялі значэнне жанчын як рэтранслятараў канфесійнай ідэнтычнасці. Таму ўлады імкнуліся процідзейнічаць выхаванню дзяцей у змяшаных шлюбах паводле каталіцкай традыцыі [2].

Напрыклад, у 1890 г. вялася справа пра жыхара г. Віцебска двараніна-католіка Паўла Андрыеўскага і яго жонку бешанковіцкую мяшчанку Пелагею Сцяпанаўну Кісялёву, якая фармальна належыла да праваслаўнай царквы [3]. Пры гэтым яна хрысціла і выхоўвала сваіх дзяцей у каталіцкай веры. Характэрна, што да скасавання ўніяцкай царквы Пелагея Сцяпанаўна належыла да ўніяцтва, а пасля была аўтаматычна залічана ў праваслаўныя. Але гэта не адбілася на яе канфесійным самаўспрыманні. Яшчэ да замужжа яна стала наведвала касцёл Св. Барбары ў Віцебску. Такім чынам, каталіцызм быў свядомым выбарам Пелагеі Андрыеўскай, у адпаведнасці з якім яна выхоўвала ў каталіцкай традыцыі сваіх дзяцей. Каталіцкае веравызнанне мужа ў дадзеным выпадку не з'яўлялася асноўным фактарам.

Жанчыны не заўсёды з'яўляліся асноўнымі актарамі ў захаванні канфесійнай ідэнтычнасці. Нярэдкімі былі выпадкі, калі яны дзейнічалі пад уплывам мужоў. У 1866 г. жонка селяніна Ракаўскай воласці Мінскага павета Людвіга Янчэўскага праваслаўная Іаана Андрэеўна не пусціла ў дом праваслаўнага святара Мацкевіча, патлумачыўшы гэта тым, што ёй забараніў муж-католік [4, арк. 2 адв.].

Святар Мацкевіч сцвярджаў, што 5 студзеня, перад Раством, Іанна Янчэўская не пусціла яго ў дом са словамі «каталіцкі лацінскі ксёндз не бывае ў нас дома, так і вы не ідзеце, не патрэбна». На думку святара, такім словам яе маглі навучыць толькі палітычна і рэлігійна

нядобранадзейныя муж і сыны. Як бачым, мясцовы праваслаўны клір адмаўляў Іаане Янчэўскай у актыўнай ролі і наяўнасці ў яе свядомай канфесійнай ідэнтычнасці. Улады і ў іншых выпадках імкнуліся падкрэсліць залежнасць жанчын ад канфесійнай прыналежнасці мужа. У 1886 г. пры разглядзе справы пра таемны пераход у каталіцызм жонкі валаснога пісара Мішкаўскай воласці Віцебскага павета Адама Бінкевіча Алены (праваслаўнай), сцвярджалася, што яна наведвае касцёл «каб дагадзіць мужу свайму католіку». Але тое, што яна наведвала касцёл адкрыта, дазваляе меркаваць, што гэта быў яе самастойны выбар [5].

У лік людзей, якія ўплывалі на жанчын, улады, перш за ўсё, залічвалі каталіцкае духавенства і памешчыкаў. Ваенны начальнік Себежскага павета Віцебскай губерні ў сваім рапарце ваеннаму начальніку горада Віцебску У. Вяроўкіну галоўнай прычынай супраціўлення пераводу ў праваслаўе называў наяўнасць «паноў», якія бралі на службу сялянскіх дзяцей і паступова прымушалі іх прыняць сваю «панскую веру». Ён лічыў, што так адбылося і ў выпадку з былой дваравой сялянкай У. Сцяпанавай, якая з праваслаўнай сям'і трапіла ў дом памешчыка Вяльгорскага [6, арк. 2]. Яна адмаўлялася прыняць праваслаўе, пры гэтым яе бацькі былі праваслаўнымі. Ваенны начальнік прапаноўваў ваеннаму губернатару падвергнуць У. Сцяпанаву манастырскаму пакаранню або высылцы ў аддаленыя месцы Расійскай імперыі для прыкладу іншым [6, арк.1 адв.].

Але ў значнай частцы выпадкаў улады не маглі спісаць рэлігійную ўпартасць жанчын на ўплыў іх акружэння. Паказальным у гэтым выпадку з'яўляецца справа дваранкі Лізаветы Фадзеевай. З-за нежадання прыняць праваслаўную веру ў 1863 г. яна была саслана ў Пінскі Варварынскі жаночы манастыр, дзе знаходзілася больш за 10 год, і была вызвалена толькі ў 1874 г. Пры гэтым яна павінна была не «паведамляць іншым сваіх памылковых рэлігійных меркаванняў» [7, арк. 2].

У 60-я гг. XIX ст. святар Дзядзінскай царквы (Себежскі павет) падаваў скаргу наконт таго, што мяшчанка Усціння Аляксандрава, якая жыла ў карчме ў вёсцы Грошава, з'яўляючыся праваслаўнай, спакушала ў каталіцызм жыхароў суседніх вёсак [6, арк. 1]. Сама Усціння сведчыла, што яна сапраўды спявала некаторыя малітвы па-польску, але на момант следства цалкам адмовілася ад гэтага. Удава з вёскі Грошава Варвара і дзеўка Праскоўя паказалі, што насамрэч Усціння Аляксандрава вучыла іх па-польску, малітваў па-руску яны не ведалі (іх бацькі былі ўніятамі), а ў іх атачэнні амаль усе маліліся па-польску [6, арк. 1 адв.]. Як бачым, і ў выпадку Усцінні Аляксандравай вызнаванне каталіцызму было свядомым (хоць і таемным) выбарам.

Дастаткова часта, асабліва пасля выдання ўказа аб свабодзе веравызнання у 1905 г., жанчыны пераходзілі ў каталіцызм, пры гэтым маючы праваслаўнага мужа і дзяцей, якія па-ранейшаму заставаліся

праваслаўнымі. Напрыклад, у 1911 г. такім чынам стала каталічкай 25-гадовая жыхарка Дрысенскага павету Багуміла Зашчырынская [8].

Жанчыны маглі ўспрымацца таксама і як «падбухторшчыкі» ў справе захавання каталіцкай канфесійнай свядомасці. У вышэйзгаданай справе Янчэўскіх каталіцкая зацятасць сям'і тлумачылася ўладамі тым, што Юльян Янчэўскі атрымаў адукацыі ў двары памешчыцы Свентарэцкай, сасланай за ўдзел у паўстанні 1863–1864 гг.

Такім чынам, у справе захавання традыцыйнай рэлігійнай ідэнтычнасці (пераважна каталіцкай) у другой палове XIX – пачатку XX ст. жанчыны маглі выконваць некалькі асноўных ролей. Яны маглі ўплываць на дзяцей і мужоў, а таксама іншых прадстаўнікоў свайго атачэння. Яны адзінаасобна маглі адстойваць сваю каталіцкую ідэнтычнасць, нават калі іх бліжэйшыя родзічы трымаліся праваслаўя. Нярэдка жанчыны траплялі пад уплыў мужчын (мужоў, сыноў, ксяндзоў, памешчыкаў, іншых аўтарытэтных асоб), які агітавалі іх пераходзіць у каталіцызм. Часам расійскія ўлады разглядалі памешчыц як праваднікоў каталіцкага ўплыву сярод сялян.

Атрымоўваецца, што жанчыны ў другую палове XIX – пачатку XX ст. выяўлялі большую, чым мужчыны, рэлігійнасць, у тым ліку каталіцкую. Нярэдка яны былі свядовымі захавальнікамі і транслятарамі каталіцкай ідэнтычнасці.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Сборник узаконений и распоряжений правительства по польскому мятежу 1863 г., вышедших по 28 января 1868 г. и касающихся западных губерний. Киев, 1868.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 31449. Дело по предписанию командующего войсками Виленского военного окргуа о представлении сведений о вредном влиянии жен-полячек на офицеров Витебского батальона внутренней стражи. 1864 г.
3. НГАБ. Ф. 1430. Воп. 2. Спр. 66. Дело о переходе из православия в католичество дворянки Пелагеи Андржеевской. 1890 г.
4. НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1813. Рапорты военного начальника Минского уезда о крестьянине Л. Янчевском, враждебно настроенном против православной веры и неблагонадежном в политическом отношении. 1866 г.
5. НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 38553. Дело по рапорту начальника Витебской губернского жандармского управления о тайном исповедании католической религии женой писаря Мишковской волости Витебского уезда Е. Бинкевичевой (православного исповедания). 1886–1887 гг.
6. НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 31964. Дело о переходе из православия в католицизм мещанок Александровой и Иозефы Степановой. 28.04.1864–06.06.1864.
7. НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 2561. Дело о разрешении Фадеевой исповедовать римско-католическую веру. 16.08.1874–22.01.1875.
8. НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 47962. Дело о переходе из православия в католицизм Богумилы Защиринской. 1911 г.